«ПОЛЫМЯ СВЕТУ» ЗАВІТАЕ Ў КОЖНЫ КУТОК БЕЛАРУСІ

Запальванне агню II Еўрапейскіх гульняў прызначана на 3 мая ў Рыме

А затым маршрут эстафеты агню «Полымя свету» будзе пракладзены па тэрыторыі Італіі, Славеніі, Аўстрыі, Венгрыі, Славакіі, Чэхіі, Польшчы і завершыцца ў Беларусі.

«Эстафета агню — традыцыйнае мерапрыемства, якое праводзіцца ў рамках Алімпійскіх гульняў. Для Еўрапейскіх гульняў традыцыя яшчэ закладваецца, але на I Еўрапейскіх гульнях таксама была эстафета агню, якая праходзіла толькі па тэрыторыі краіны-арганізатара. Наша эстафета будзе адрознівацца большай маштабнасцю і большай значнасцю», — адзначае **начальнік упраўлення па цырымоніях і культурнай праграме Дырэкцыі Сяргей Хоміч** у сваім інтэрв'ю афіцыйнаму сайту Гульняў. І дадае, што многія традыцыі Еўрапейскіх гульняў яшчэ толькі закладваюцца і менавіта беларусы стаяць каля іх вытокаў, якія гадоў праз 20—30 будуць звыклымі для падобных спаборніцтваў.

Было прынята рашэнне, што эстафета агню павінна стартаваць у Рыме, дзе знаходзіцца штаб-кватэра ЕАК. Мяркуецца, што і на ўсіх наступных Еўрапейскіх гульнях эстафета агню будзе стартаваць менавіта тут. У Вечным горадзе 3 мая адбудзецца вялікая ўрачыстая цырымонія запальвання агню для Гульняў у Мінску. Месцам яе правядзення стане музейны комплекс Ara Pacis Museum, дзе знаходзіцца Арка свету — помнік архітэктуры, узрост якога больш за дзве тысячы гадоў. У ходзе ўрачыстага мерапрыемства будзе прэзентаваны сімвал акцыі — аліўкавае дрэва, а таксама запалены першы факел эстафеты агню II Еўрапейскіх гульняў.

Аліўкавае дрэва выраблена спецыяльна для ЕАК. Яно распасцірае свае карані ў глыбіню часоў і падымае галіны, каб прыняць спартсменаў 50 нацый. Сімвалічна, што працягласць эстафеты агню складзе 50 дзён. Першыя дні полымя будзе знаходзіцца ў Італіі. Яго даставяць у мястэчка Курмаёр (вобласць Валле-д'Аоста) на мяжы Італіі і Францыі. Тут непадалёк знаходзіцца найвышэйшая кропка Еўропы — гара Манблан. Полымя і сцяг II Еўрапейскіх гульняў, а таксама дзяржаўны сцяг Беларусі будуць узняты на гэты пік беларускімі альпіністамі, сярод якіх ёсць і пакарыцелі Эверэста.

«Пасля ўдзельнікі байкерскага клуба The one chapter Belarus будуць суправаджаць «Полымя свету» ў Беларусь, прарабіўшы вялікі шлях па такіх краінах Еўропы, як Славенія, Аўстрыя, Венгрыя, Славакія, Чэхія, Польшча. Падчас руху калоны па Еўропе на кожным матацыкле будзе размешчаны дзяржаўны сцяг Беларусі і сцяг эстафеты. Караван эстафеты наведае ўсе нацыянальныя алімпійскія камітэты вышэйпералічаных краін», — расказвае Сяргей Хоміч.

Частка эстафеты па тэрыторыі нашай краіны пачнецца з Брэста. У кожнай вобласці эстафета прабудзе па шэсць дзён. Стартуюць абласныя этапы з урачыстага канцэрта. Маршрут эстафеты будзе максімальна набліжаны да самых знакавых аб'ектаў і мясцін рэгіёнаў.

У Брэсцкай вобласці «Полымя свету» будзе знаходзіцца 12—17 мая, у Гродзенскай — 18—23 мая, у Віцебскай — 24—29 мая, у Магілёўскай — 30 мая — 4 чэрвеня, у Гомельскай — 5—10 чэрвеня, у Мінскай вобласці — 11—16 чэрвеня.

Непасрэдна ў Мінску эстафета пройдзе 17—21 чэрвеня. За гэты час Полымя правязуць па цэнтральных праспектах (Пераможцаў, Незалежнасці). Таксама яно пабывае на мінскіх прадпрыемствах, у парках і сталічных славутасцях. Маршрут эстафеты завершыцца на Нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама». На гэтай арэне 21 чэрвеня падчас цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў будзе запалены агонь форуму.

Удзел у эстафеце агню ў Беларусі возьмуць 450 факеланосцаў, якімі стануць найлепшыя спартсмены краіны, вядомыя спецыялісты, аўтарытэтныя дзеячы навукі, культуры і мастацтваў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Факел распрацавала дызайнер Юлія Брайчук, ён выраблены ў Навагрудку на заводзе газавай апаратуры. Корпус зроблены з нержавеючай сталі, важыць факел крыху больш за 1,7 кг, яго вышыня 81 см. А галоўная асаблівасць — контур «папараць-кветкі», скрозь які будзе прарывацца агонь.

ПЕРАЛОМНЫ МОМАНТ ПАСТАЯНСТВА

Сённяшні рост выдыхаецца канчаткова

Цяпер ужо ні для кога не сакрэт, што актыватарам устойлівага попыту на рынку жылля Мінска (які назіраецца ў апошнія некалькі гадоў) выступіла спалучэнне двух фактараў. Гэта з'яўленне «танных» крэдытаў на фоне адсутнасці эканамічных узрушэнняў, у прыватнасці стабільнасці абменных курсаў валют. Напалову зменшыліся стаўкі крэдытавання (у сярэднім з 35 % да 15 % гадавых), якія цалкам кампенсавалі пакупнікам і недахоп уласных сродкаў і, адсутнасць адчувальнага росту даходаў.

У выніку стабільнага фінансава забяспечанага попыту цэны ў 2017 годзе пайшлі ўверх. Але не так інтэнсіўна, як гэта было раней (у 2012—2013 гадах). Усяго за перыяд з апошняга падарожання да цяперашняга часу дэльта росту склала плюс 15 % ці + 160 долараў.

— Сёння крэдытаванне набыцця кватэр на другасным рынку скарочана, што памяншае пакупніцкую здольнасць і вядзе да зніжэння попыту, — каментуе сітуацыю на рынку **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля сталічнага агенцтва нерухомасці Святлана КУДЗЕЛКА.** — І таму з надыходам новага сезона можна назіраць карціну, калі набываюцца ў асноўным даступныя па цане кватэры, уласнікі якіх альбо першапачаткова ставяць аб'ектыўную цану, альбо ахвотна ідуць на абгрунтаваны гандаль.

Па словах прадстаўніка агенцтва нерухомасці, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года сёлета пакупніцкая актыўнасць знізілася больш чым на 40 %. За кошт павелічэння тэрміну продажу кватэр і таго факту, што пакупнікі сталі больш таргавацца, павялічыўся сярэдні памер зніжкі, якая даецца прадаўцом пакупніку, — з 3 % да 5 %. І гэты працэс у красавіку працягвае набіраць абароты.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

❍ У тэму

Беларусбанк аднавіў выдачу крэдытаў

Нагадаем, гэты банк прыпыніў прыём новых заявак на крэдыты пад другаснае жыллё з лістапада мінулага года. А з 8 красавіка Беларусбанк зноў выдае доўгатэрміновыя крэдыты пакупнікам кватэр. Банк толькі падкарэктаваў умовы выдачы гэтых пазык. Што змянілася?

Крэдыты на куплю жылля на другасным рынку Беларусбанк цяпер выдае пад 15,4 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 5,4 працэнтнага пункта). Крэдыт можна атрымаць на тэрмін да 20 гадоў. Банк улічвае сукупны даход блізкіх сваякоў і членаў сям'і. Беларусбанк можа даць да 90 % кошту набыцця жылога памяшкання, але ў межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка.

Банк таксама змяніў каэфіцыент плацежаздольнасці атрымальнікаў крэдытаў на набыццё жылых памяшканняў. Зараз штомесячныя выплаты па крэдыце не павінны перавышаць 70 % ад штомесячных даходаў крэдытаатрымальніка (раней — 40 %). Гэты паказчык з 8 красавіка дзейнічае як пры куплі жылля на першасным рынку, так і на другасным.

Заўтра — пачатак падзення

На думку аналітыкаў рынку жылой нерухомасці, цэны на сталічныя няновыя кватэры спынілі свой рост яшчэ летам мінулага года. Сярэдняя цана квадратнага метра аднапакаёвых кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў па факце здзелак цяпер роўная 1 240 доларам, двухпакаёвых апартаментаў — 1 135 доларам, трохпакаёвых — 1 080 доларам. Рэальная сярэдняя цана аднапакаёвай кватэры дасягала 42 тысяч долараў, двухпакаёвай — 55 тысяч долараў, а трохпакаёвай — 65 тысяч долараў.

Трохі даражэй прадаваліся сталічныя кватэры, гатовыя да пражывання. Сярэдняя цана на другасным рынку такога аднапакаёвага жылля па факце здзелак складала 49 тысяч долараў. Двухпакаёвыя кватэры прадаваліся за 65 тысяч долараў, трохпакаёвыя — за 77 тысяч долараў. Як адзначаюць аналітыкі, сённяшні ўзровень цэн — гэта мяжа таго, што можа дазволіць пакупнікам надзённая эканамічная сітуацыя.

За апошнія два гады інтэнсіўнага попыту на жыллё асноўны пласт пакупнікоў, якія маглі сабе дазволіць узяць крэдыт, ужо істотна паменшыўся. Акрамя таго, апошнія паўгода адзначаецца невялікае, але ўсё ж сістэматычнае павелічэнне ставак крэдытавання і ўскладненне ўмоў атрымання крэдытаў.

Акрамя таго, колькасць прапанаваных на продаж кватэр да гэтага часу знаходзіцца на досыць высокім для Мінска ўзроўні — больш за сем тысяч кватэр. У далейшым, калі прапанова пачне назапашвацца з-за малой колькасці здзелак, то, паводле законаў рынкавага цэнаўтварэння, цэны ўжо не змогуць заставацца на месцы і пойдуць уніз. Наколькі інтэнсіўным будзе зніжэнне, залежыць ад эканамічнай сітуацыі і жадання прадаўцоў ісці насустрач пакупнікам.

— Пакуль нічога страшнага на рынку не адбываецца, — упэўненыя эксперты. — Цяпер ён знаходзіцца ў стане стабільнага чакання. Зніжэнне пакупніцкай здольнасці — гэта аб'ектыўная акалічнасць бягучай сітуацыі. І не ўлічваць яе пры вызначэнні цэн на кватэры азначае гуляць супраць саміх сябе. Бо як паказвае практыка апошніх дзесяці гадоў, усё можа памяняцца. Для наступлення негатыўных наступстваў не абавязковы нават скачок курсу валют — дастаткова захаванне практыкі завышэння цэн. Пасля чаго будзе назірацца рост колькасці прапанаваных на продаж кватэр з-за змяншэння здзелак. Наступны этап — зніжэнне цэн.

Экалогія

Праблема бытавых адходаў — «на пальцах»

Інтэрактыўная Zero waste-выстаўка адкрыецца ў Мінску 11 красавіка. Ключавой з'яўляецца частка экспазіцыі, прысвечаная прадухіленню ўтварэння адходаў. Выстаўка створана ў рамках кампаніі «Мэта 99» дзяржаўнай установай «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» у супрацоўніцтве з Цэнтрам экалагічных рашэнняў за кошт сродкаў вытворцаў і пастаўшчыкоў тавараў і ўпакоўкі.

Zero waste даслоўна перакладаецца як «нуль адходаў», «нуль страт». Гэта канцэпцыя, заснаваная на змяншэнні колькасці смецця шляхам выкарыстання шматразовых прадметаў і рэчаў, падаўжэння тэрміну службы тавараў і іх паўторнага выкарыстання ды ўвогуле скарачэння спажывання.

— Нягледзячы на ўсе намаганні па сартаванні і перапрацоўцы адходаў, што прыкладаюцца ў Беларусі, мы бачым, як колькасць смецця на звалках расце, асабліва колькасць пластыку, — акрэслівае праблему **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.** — Інтэрактыўная выстаўка — магчымасць наглядна прадэманстраваць, што кожны з нас можа змяніць сітуацыю.

Выстаўка ўключае наглядныя інтэрактыўныя стэнды, дзе дэманструюцца ўсе этапы абыходжання з адходамі і даюцца падказкі, як можна скараціць колькасць смецця, якія існуюць шматразовыя альтэрнатывы. Акрамя таго, выстаўка мае і анлайн-кампанент — мультымедыйную гісторыю, якая размешчана па спасылцы http://zawtra.by.

— Выстаўка Zero waste — першы падобны вопыт у нашай краіне: мы імкнуліся раскрыць праблему бытавых адходаў ад пачатку і да канца: ад нашага ладу жыцця, які ўплывае на склад і колькасць смецця, да спосабаў, якія чалавецтва выкарыстоўвае, каб пазбавіцца ад адходаў. Захаванне, спальванне, перапрацоўка... Ні адзін з гэтых спосабаў не можа вырашыць да канца праблему адходаў. Паўплываць на сітуацыю мы зможам, толькі калі зменім свае спажывецкія звычкі, — падкрэслівае **дырэктар установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ.**

Першы паказ выстаўкі адбудзецца ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41). На працягу года арганізатары плануюць прадэманстраваць выстаўку таксама і ў іншых гарадах краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Транспарт

БЮДЖЭТНЫЯ АВІЯКАМПАНІІ СТАРТАНУЦЬ З РЭГІЁНАЎ

У Міністэрстве транспарту і камунікацый канкрэтна заяўляюць аб тым, што іх ведамства зацікаўлена, каб лаўкосты прыйшлі ў абласныя гарады краіны.

«Наша базавая стратэгія вызначана такім чынам, што мы павінны займацца развіццём рэгіянальных аэрапортаў, — паведаміў **міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА** ў прэс-цэнтры БелТА. — Гэтыя аэрапорты сёння адпавядаюць усім стандартам. За мінулы год практычна ўсе яны прадэманстравалі нядрэнную дынаміку».

На дадзеным этапе міжнародныя аэрапорты, якія адпавядаюць усім стандартам, — гэта Гродна, Гомель, Віцебск і Магілёў. За мінулы год па ўсіх гэтых аэрапортах ёсць нядрэнная дынаміка, але гэтага вельмі недастаткова. У асноўным — выкананне чартарнай праграмы — перавозкі на адпачынак.

У Міністэрстве прынялі канцэпцыю развіцця абласных аэрапортаў. «Яна прадугледжвае стварэнне лаўкост-базы на тэрыторыі Гродзенскага аэрапорта, — адзначыў **Арцём СІКОРСКІ, дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый.** — Мы правялі шэраг перагавораў, у тым ліку ў канцы мінулага года і з азербайджанскім бокам, для прыцягнення лаўкост-кірункаў для палётаў у аэрапорты Гомель і Гродна. Сустракаліся з пасольствам Венгрыі для прыцягнення Wizz Air у аэрапорт Гродна. Падпісалі пагадненне з Эстоніяй, якое прадугледжвае магчымасць прыцягнення перавозчыка на лінію Талін — Мінск.

Дырэктар дэпартамента адзначыў, што на летні сезон падпісана пагадненне з Расіяй аб павелічэнні колькасці рэйсаў. Цяпер гэта 63 рэйсы ў тыдзень для кожнага з бакоў. На рэйс Мінск — Жукоўскі прызначаная авіякампанія «Уральскія авіялініі» з частатой 14 рэйсаў у тыдзень. Цяпер расійская кампанія «ІрАэра» атрымала прызначэнне на тры рэйсы ў гомельскі аэрапорт. Прапрацоўваюцца з кампаніяй S7 палёты ў аэрапорт Гродна.

Крыху раней праходзілі перагаворы з польскім бокам. Спецыялісты абмяркоўвалі арганізацыю палётаў з Кракава ў Гродна і з Варшавы ў Гомель. На наступным тыдні ці праз тыдзень будуць перагаворы з украінскім бокам. Найбольш прыдатнай тэрыторыяй для развіцця лаўкост-кірунку ў Мінтрансе лічаць менавіта аэрапорт у Гродне.

Сяргей КУРКАЧ.

❍ Тым часам

А ў Магілёве значна танней

У кожным абласным горадзе прапанова кватэр значна перавышае дзеючы попыт. Самая малая колькасць прыватнага другаснага жылля на продаж знаходзіцца ў Брэсце. Агенцтвы нерухомасці прапануюць у гэтым рэгіёне прыкладна 1,5 тысячы аб'ектаў жылой нерухомасці. Цэны тут не такія завоблачныя, як у сталіцы, але ўсё-ткі «кусаюцца». Сярэдняя цана квадратнага метра стандартнай кватэры знаходзіцца ў дыяпазоне ад 650 да 750 долараў. Невялікія аднапакаёвыя кватэры можна вытаргаваць за 25 тысяч долараў. А вось прасторная трохпакаёвая кватэра з еўрарамонтам прапануюцца ўжо за 66 тысяч долараў. Даражэй у горадзе над Бугам бываюць толькі кватэры, гатовыя да пражывання. Такое жыллё з кухняй і бытавымі прыборамі будзе каштаваць з разліку 800—850 долараў за квадратны метр.

Прыёмная кампанія — 2019

У Гродне пачнуць рыхтаваць фізікаў-праграмістаў

Як паведамляе прэс-служба Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, сёлета ўпершыню на фізіка-тэхнічным факультэце будзе аб'яўлены набор на спецыяльнасць «Камп'ютарная фізіка». Каб у будучыні стаць фізікам-праграмістам, абітурыенту неабходна здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай або рускай мове, фізіцы і матэматыцы.

Пасля чатырох гадоў навучання выпускнік атрымае кваліфікацыю «Фізік. Праграміст». Важным адрозненнем новай спецыяльнасці з'яўляецца фундаментальная падрыхтоўка па агульнай і тэарэтычнай фізіцы, а таксама вывучэнне электронікі, мікрапрацэсарнай тэхнікі, аўтаматызацыі і робататэхнікі. Гэта адкрывае магчымасці для працаўладкавання не толькі ў IT-кампаніях, але і на сучасных высокатэхналагічных вытворчасцях.

Акрамя таго, сёлета ў ГрДУ імя Янкі Купалы будзе адноўлены набор па спецыяльнасці «Гісторыя (археалогія)» на факультэце гісторыі, камунікацыі і турызму. Выпускнік атрымае кваліфікацыю «Гісторык-археолаг. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін». А на факультэце эканомікі і кіравання аднаўляецца набор на завочнае скарочанае навучанне па спецыяльнасці «Камерцыйная дзейнасць». Пасля заканчэння вучобы выпускніку прысвойваецца кваліфікацыя «Эканаміст».

Варта адзначыць, што ў 2019 у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ўпершыню будзе зроблены набор студэнтаў для навучання на завочнай (скарочанай) форме па спецыяльнасці «Транспартная лагістыка» (кірунак «Аўтамабільны транспарт») на факультэце інавацыйных тэхналогій машынабудавання. Выпускнікам будзе прысвойвацца кваліфікацыя «Інжынер-эканаміст. Лагіст».

Акрамя таго, у гэтым годзе абітурыенты, якія паступаюць на філалагічны факультэт па спецыяльнасці «Рамана-германская філалогія (нямецкая)», змогуць падаць сертыфікат ЦТ на выбар або па нямецкай, або па англійскай мове. Разам з сертыфікатам па замежных мовах выпускнік павінен падаць у прыёмную камісію сертыфікаты па беларускай або рускай мове, а таксама па гісторыі Беларусі. Падобныя новаўвядзенні чакаюць і тых, хто паступае на факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму на спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый», кірунак «Знешнеэканамічныя сувязі». Абітурыент можа падаць сертыфікат па англійскай або кітайскай мове на выбар, а таксама па беларускай або рускай мове і па гісторыі Беларусі.

Усяго сёлета ў ГрДУ імя Янкі Купалы на першай ступені вышэйшай адукацыі будзе ажыццяўляцца набор па 50 спецыяльнасцях.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАСАДЗІ ДРЭВА — ПРАЯВІ ЛЮБОЎ ДА КРАІНЫ

Міністэрства лясной гаспадаркі прапаноўвае ўсім ахвотным прыняць удзел у штогадовай акцыі «Тыдзень лесу», якая сёлета пройдзе з 13 да 20 красавіка. Яна прысвечана 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і прымеркавана да Года малой радзімы. «Дрэва саджаю — і тым ганаруся! Будзе зялёнай мая Беларусь!» — такі слоган акцыі, яго выбралі па выніках конкурсу на лепшы дэвіз кампаніі сёлета.

Першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Валянцін Шатраўка адзначыў, што з дапамогай валанцёраў плануецца пасадзіць 20 мільёнаў дрэў на агульнай плошчы больш за чатыры тысячы гектараў, і работа будзе праводзіцца на 2293 аб'ектах па ўсёй краіне. Да таго ж, будзе добраўпарадкавана 190 месцаў адпачынку, створана больш за 100 алей памяці. Удзельнікам мерапрыемства можа стаць кожны, дастаткова звярнуцца ў найбліжэйшае лясніцтва або лясгас.

Дарэчы, акцыя пройдзе дванаццаты раз. Летась у ёй прыняло ўдзел 80 тысяч чалавек і было пасаджана 25 мільёнаў дрэў. Таксама ўпершыню сёлета па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі пройдзе конкурс сярод устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У кожнай вобласці адзначаць самыя актыўныя класы і школы, якія высадзяць найбольшую колькасць дрэў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ ДЫРЭКТАРАМ ШКОЛЫ?

Адказ на гэтае пытанне павінны даць фіналісты конкурсу «Малады дырэктар — 2019», які пройдзе ў Мінскай вобласці 11—12 красавіка. Падобныя конкурсы для кіраўнікоў-«навабранцаў» становяцца для сталічнага рэгіёна ўжо традыцыйнымі. Сёлета мерапрыемства праводзіцца трэці раз, у ім бяруць удзел 23 дырэктары, якія маюць стаж работы на кіруючай пасадзе да пяці гадоў.

17 удзельнікаў абласнога конкурсу «Малады дырэктар — 2019» працуюць у сельскай мясцовасці, шасцёра прадстаўляюць вучэбна-педагагічныя комплексы, двое ўзначальваюць гімназіі, пяцёра маюць стаж кіраўніцкай дзейнасці да аднаго года. Мужчын-кіраўнікоў у гэтым годзе сем. Педагогі ўжо спаборнічалі ў завочных конкурсных выпрабаваннях: стварэнні відэакейса «Я — дырэктар» і распрацоўцы праграмы развіцця сваёй установы адукацыі. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага аблвыканкама, Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі і абласны камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Надзея НІКАЛАЕВА

ПЕНСІЯНЕРЫ ПАЛІЛІ СМЕЦЦЕ І ТРАВУ...

Чарговае такое здарэнне адбылося ў Глыбоцкім раёне.

Увечары ў службу ратавання паступіла паведамленне пра загаранне дома ў вёсцы Лужкі. Калі ратавальнікі прыбылі на месца, дзве гаспадарчыя пабудовы і дах жылога дома былі цалкам ахоплены полымем. Гаспадыня падворка, 80-гадовая пенсіянерка, на момант узнікнення пажару знаходзілася ў доме, да прыбыцця падраздзялення МНС пакінула жыллё самастойна, не пацярпела.

Па інфармацыі МНС, агнём цалкам знішчаны лазня і хлеў, дах жылога дома і маёмасць унутры. Па гэтым факце праводзіцца праверка. Версія пажару, якая разглядаецца, — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры спальванні смецця гаспадыняй падворка.

А ў Жлобінскі раённы аддзел МНС ад фельчара па прамой лініі паступіла паведамленне аб загаранні дома і травы ў вёсцы Краснабярэжская Слабодка. Калі да месца выкліку прыбылі ратавальнікі, было ўстаноўлена, што на прысядзібным участку адбылося загаранне сухой расліннасці на плошчы 0,2 гектара, загінуў гаспадар. Гарэнне хаты не пацвердзілася.

Высветлілася, што пажылыя жонка і муж наводзілі парадак на сваім прысядзібным участку, спальвалі смецце. У нейкі момант вогнішча засталося без нагляду. Ад яго пачала гарэць сухая трава. Жанчына паклікала мужа дапамагчы тушыць агонь. Муж і жонка рабілі гэта, затоптваючы траву і выкарыстоўваючы падручныя сродкі. Праз нейкі час на мужчыне загарэлася адзенне... Жанчына атрымала апёкі рукі, нагі і твару першай-другой ступені (ад шпіталізацыі адмовілася). Да прыбыцця ратавальнікаў агонь патушылі суседзі.

Паводле аператыўных даных МНС, гэта пяты выпадак з пачатку пажаранебяспечнага перыяду, калі разам з загараннем травы выяўлялі загінулых людзей. Усяго з пачатку года ратавальнікам паступіла больш за тысячу паведамленняў аб загаранні травы і кустоў.

Ні ў якім разе не паліце траву, нагадваюць чарговы раз у МНС. Не пакідайце агонь без нагляду. Старанна тушыце недакуркі і запалкі перад тым, як выкінуць іх. Так, прычынай пажару, які знішчыў 17 пабудоў у Смаргонскім раёне, згодна з папярэдняй версіяй, стаў менавіта кінуты недакурак. Дапамажыце бяспечна навесці парадак сваім старым і суседзям.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У пошуках містыкі, волатаў і «электрычнага чалавека»

Юбілейны, дзясяты фэст экскурсаводаў сёлета запрашае наведаць больш за тры сотні экскурсій, якія пройдуць па ўсёй краіне. Найбольш прапаноў для цікавых падарожжаў у Мінску.

13 і 14 красавіка вы зможаце выбраць такія праграмы для ўік-энду, якіх пазней не замовіць ні ў адным турыстычным агенцтве. Тут не будзе аглядных экскурсій. Як прафесійныя атэставаныя, так і маладыя гіды распрацавалі аўтарскія праграмы. Да мерапрыемства далучыліся краязнаўцы, настаўнікі, гісторыкі, музейныя супрацоўнікі. Пазнавальныя сустрэчы ў вёсках таксама будуць праводзіць святары, а ў Віцебску паспрабуюць свае сілы маленькія экскурсаводы — выхаванцы абласнога палаца дзяцей і моладзі. Арганізатары абяцаюць, што падрыхтавана багата навінак, будуць квэсты, інтэлектуальная гульня, лекцыі з археолагамі і гісторыкамі.

Галоўная ідэя фэсту — звярнуць увагу людзей на мясціны, у якіх яны жывуць. Усюды можна знайсці арыгінальную і цікавую інфармацыю. Так, у Мінску пройдуць экскурсіі па Грушаўцы, Серабранцы, Гарадскім вале, Старажоўцы, можна будзе даведацца пра таямніцы Пушкінскага пасёлка каля парку імя Чалюскінцаў ды іншае.

Шмат незвычайных падарожжаў падрыхтавалі рэгіёны. Напрыклад, на пошукі волатаў запрашае **Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей**, што ў **аграгарадку Акцябрская** Віцебскага раёна. **«Сцяжынамі Коласа»** прапануюць прайсці ў **Люсіне** на Піншчыне, тут у пачатку мінулага стагодзя беларускі класік працаваў настаўнікам і падаў гэтыя мясціны пад назвай Цельшына ў трылогіі «На ростанях». Дзяцей і людзей з абмежаванымі магчымасцямі чакаюць на квэст-экскурсіях у Глыбокім. Аматараў веласіпедных экскурсій парадуе Жабінка — маршрут, падчас якога яны будуць знаёміцца з біяграфіяй Тадэвуша Касцюшкі, складае 52 кіламетры і разлічаны на шэсць гадзін! А чаму б не даведацца, дзе жыў «электрычны чалавек»? Так у народзе празвалі Якуба Наркевіча-Ёдку (гасцей сустрэнуць у фальварку Наднёман).

Рэгістрацыя на ўдзел у фэсце экскурсаводаў на сайце festguides.by толькі пачалася, але на многія бясплатныя экскурсіі ўжо не трапіць — групы набраліся за першыя некалькі гадзін. Асаблівы попыт на містычнае падарожжа па Мінску, экскурсію на піўзавод і дзіцячыя квэсты. Але яшчэ многа куды можна трапіць і без рэгістрацыі. Турыстаў чакаюць Гомель, Жлобін, Пружаны, Зэльва, Добруш, Бешанковічы, Ляхавічы, Полацк, Слонім, Гродна, Ваўкавыск, Бабруйск, Докшыцы, Слуцк, Крычаў, Пухавічы, Івацэвічы, Высокае і нават у Мадрыдзе і Беластоку беларусам будуць рады.

Фэст экскурсаводаў — беларуская версія святкавання Міжнароднага дня помнікаў і мясцін. Як заўважыў **прадстаўнік беларускага камітэта ICOMOS (аднаго з арганізатараў мерапрыемства) Цімох АКУДОВІЧ,** экскурсіі — гэта адна з формаў захавання гістарычных аб'ектаў. Пасля лакальных падарожжаў людзі мяняюць сваё стаўленне да спадчыны, клапоцяцца пра яе захаванне, больш даведваюцца пра гісторыю і культуру сваёй радзімы.

Кансультант аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Марына МАСТАШОВА адзначыла, што фэст экскурсаводаў спрыяе развіццю ўнутранага турызму. За дзесяць гадоў, як ён праводзіцца, з рознымі мясцінамі Беларусі пазнаёмілася больш за чатыры тысячы чалавек. Падчас мерапрыемства нараджаюцца новыя формы работы з турыстамі. Напрыклад, веласіпедныя экскурсіі і падарожжы для людзей з інваліднасцю спачатку былі апрабаваныя менавіта на фэстах экскурсаводаў.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.